Інфармацыйны бюлетэнь
камітэта абароны рэпрэсаваных
«Салідарнасьць»

РУХ ЗА СВАБОДУ

# НЯ БОЙЦЕСЯ!

САЛІДАРНАСЬЦЬ СВАБОДА

www.salidarnasc.org
e-mail: info@salidarnasc.org

нумар 24 ліпень 2011

# АКЦЫІ АПЛАДЫСМЕНТАЎ



КАДРЫ З МІНСКА, КАЛІ ЛЮДЗІ ПРОСТА СТАЯЦЬ НА ТРАТУАРАХ І АПЛАДЗІРУЮЦЬ, АБЫШЛІ ЎСЕ СУСВЕТНЫЯ ТЭЛЕКАНАЛЫ.

# «Народныя гулянні» напужалі ўладу

## РЭПРЭСІІ ЗА ВОПЛЕСКІ



Штосераду з пачатку чэрвеня людзі выходзяць на вуліцы вялікіх і малых беларускіх гарадоў,на «маўклівыя акцыі», «народныя гулянні». Яны хочуць мірна і законна выказаць сваю незадаволеннаць сітуацыяй у краіне. Пратэстоўцы не скандуюць ніякіх лозунгаў, а спакойна шпацыруюць, ядуць марозіва, пляскаюць ў ладкі — і ўсё ж іх затрымліваюць — жорстка, з ужываннем фізічнай сілы, некаторых моцна збіваюць.Улады ўспрымаюць гэтыя акцыі ледзь не за спробу бунту.

Відавочна, што новая ініцыятыва самаарганізацыі і самавыяўлення грамадзян успрымаецца як спроба кансалідацыі пратэстных настрояў супраць існуючага рэжыму. І абыходзяцца з ёй адпаведным чынам: імкнуцца задушыць пратэст ў самым ягоным пачатку, каб запалохаць і збіць пратэстную хвалю.

Прыкладна 460 чалавек было затрымана 15 чэрвеня.

У сераду 29 чэрвеня ў Мінску цэнтр быў блакаваны міліцыяй, сотні чалавек былі затрыманыя. Таксама ў нядзелю 3 ліпеня маўклівая акцыя пратэсту ў Мінску на Прывакзальнай плошчы была жорстка разагнаная міліцыяй. Ў Дзень Незалежнасці ў Беларусі былі затрыманы не менш за 390 чалавек, 210 чалавек у Мінску і каля 180 — у рэгіёнах.

Праваабаронцы канстатуюць, што затрыманні грамадзян ажыццяўляюцца супрацоўнікамі МУС насуперак дзейным нормам беларускага заканадаўства, з ўжываннем празмернай сілы супраць мірных людзей.

**«Тое, што робіць зараз Лукашэнка ў Беларусі, самае сапраўднае дзікунства. І я не ведаю тут ніякіх палітычных сілаў, якія маглі б гэтае дзікунства апраўдваць ці падтрымліваць. Той масавы тэрор, які публічна дазваляе сабе праводзіць сённяшні рэжым супраць сваіх грамадзянаў, проста беспрэцэдэнтны.**

**Раз за разам на мірных маўклівых акцыях ужываецца сіла, прычым, ніякім правам, натуральна, гэта абгрунтаваць немагчыма».**

***Праваабаронца Вячаслаў Сіўчык.***

## НЕБЯСПЕЧНЫ ВЫХАД ЗА ПРАВАВОЕ ПОЛЕ

Праваабаронца з «Вясны» **Наста Лойка** кажа пра яўныя парушэнні закону супрацоўнікамі міліцыі падчас разгону «народных гулянняў»:

«Людзі скардзяцца на тое, што іх затрымлівалі асобы ў цывільным, якія не называлі сябе, нічога не тлумачылі і пры гэтым дзейнічалі вельмі груба ці нават гвалтоўна.

Міліцыянты былі без формы, без картак з прозвішчамі. Было незразумела, што гэта за людзі, чаму яны ўжываюць фізічную сілу і кудысьці валакуць. У большасці людзей было ўражанне, што гэта проста хуліганы, якія іх выкрадаюць. Пры гэтым яны не тлумачылі падставы затрымання і надалей толькі грубілі, у тым ліку ўжывалі нецэнзурную лаянку. Мы на ўсё гэта звяртаем увагу ў скаргах і будзем чакаць выніку іх разгляду».

Адміністратары суполкі «ВКонтакте», якія ініцыявалі «маўклівыя» акцыі, змясцілі на сваёй старонцы адкрыты зварот да Аляксандра Лукашэнкі.

Яны кажуць, што няма ніякіх нават фармальных прычынаў да ўжыцця гвалту ў дачыненні да мірных дэманстрантаў:

«Хто гэтыя бандыты? Хто аддае ім загады? Чаму імі камандуюць службовыя асобы Мінскага гарадскога ўпраўлення ўнутраных спраў? Чаму бяздзейнічаюць пракуратура і міліцыя?» — задаюць яны пытанне пра людзей у цывільным, якія хапаюць удзельнікаў мерапрыемстваў.

Аўтары звароту кажуць, калі Лукашэнка пакрывае гэтых людзей, то бярэ і на сябе адказнасць.

«Калі вы думаеце, што такім чынам вы зможаце запалохаць ўвесь народ, то вы памыляецеся. Мы не будзем спыняцца, акцыі будуць праводзіцца пры любых умовах. Вы спрабуеце рэпрэсаваць аднаго — на яго месца прыходзіць трое», — напісана ў звароце.



# АНДЖЭЙ ПАЧОБУТ: «Я ПЕРАЖЫВАЎ, ЯК БУДЗЕ ЖЫЦЬ МАЯ СЯМ’Я»




**На першай прэс-канферэнцыі пасля вызвалення з-за кратаў журналіст Анджэй Пачобут падзяліўся сваімі меркаваннямі і ўражаннямі.**

Суд Ленінскага раёна прызнаў Анджэя Пачобута вінаватым у паклёпе на адрас прэзідэнта Лукашэнкі і прысудзіў да трох гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай на 2 гады. Другое абвінавачванне — ў абразе прэзідэнта- з журналіста было знята за адсутнасцю складу злачынства.

Працэс адбываўся з перапынкамі з 14 чэрвеня па 4 ліпеня ў Ленінскім раённым судзе Гродна. Ён праходзіў у закрытым рэжыме, у суд не пускалі родных Анджэя Пачобута, тыя, хто хацеў выказаць з ім салідарнасць, мусілі чакаць на вуліцы. Адтэрміноўка прысуду на 2 гады была для Анджэя Пачобута поўнай нечаканасцю.

— Калі мяне вялі на абвяшчэнне прысуду, я бачыў у двары аўтазак, — распавёў журналіст на прэс-канферэнцыі. — Я быў адзіным, каго прывезлі пасля абеду з турмы ў суд. Аўтазак не ад’ехаў, і я думаў, што хутка паеду на ім назад у турму

— Мая справа ў горадзе была гучнай, — зазначыў Анджэй. — Прыемна было, калі на вуліцы да мяне падыходзілі незнаёмыя людзі, ціснулі руку і казалі словы падтрымкі.

Самым страшным у турме для Анджэя былі не поўная ізаляцыя ад знешняга свету і не ўмовы ўтрымання.

— Я перажываў, як будзе жыць мая сям'я, — кажа ён.

Цяпер яму трэба выплаціць 6 мільёнаў падатку і адзін мільён штрафу.

Анджэй Пачобут пачаў рыхтаваць рэпартаж аб знаходжанні ў СІЗА для «Газеты Выборчай».

— На паверсе са мной сядзеў інвалід першай групы без абедзвюх рук. Яго абвінавачвалі ў тым, што ён збіў супрацоўніка міліцыі. Я бачыў там людзей, паважаных у горадзе, прадпрымальнікаў, якія пасля змены ўлады ў Гродна апынуліся за кратамі.

Анджэй успамінае, як у турме праходзілі святы:

— На Вялікдзень нам прынеслі фарбаваныя яйкі. Хоць да мяне — адзінага — не пускалі ксяндза ўвесь гэты час. На дзень нараджэння сукамернікі накрылі для мяне стол: гарбата з шакаладнымі цукеркамі. А лідар арганізаванай злачыннай групоўкі, якая займалася згонам машын (пазней яго асудзяць на 10,5 гадоў) падарыў мне ўпакоўку з-пад ёгурту са зрэзаным верхам. Туды можна было класці пасту, зубную шчотку. Паверце, такія цацкі ў турме маюць велізарнае значэнне. Лісты з віншаваннямі я атрымаў толькі праз некалькі дзён.

На думку Анджэя Пачобута, за тыя месяцы, якія ён правёў у зняволенні, папулярнасць Аляксандра Лукашэнкі ўпала «ніжэй плінтуса», у тым ліку і сярод работнікаў турмы.

У бліжэйшы час Анджэй падае касацыйную скаргу ў суд. Журналіст мае намер, калі спатрэбіцца, прайсці ўсе інстанцыі, да Камітэта ААН па правах чалавека, каб даказаць, што ён невінаваты.

Нагадаем, дзве экспертызы тэкстаў Пачобута праводзілі супрацоўнікі ідэалагічнага аддзела Гродзенскага аблвыканкама Павел Скрабко і Віктар Жалезніковіч, а таксама прафесар ГрДУ Аляксей Нікіцевіч. Яны знайшлі ў матэрыялах Пачобута не толькі паклёп у адрас прэзідэнта, але і дыскрэдытацыю Беларусі.

На прэс-канферэнцыі Анджэй распавёў калегам з Гродна, што ніхто з экспертаў не быў у стане адказаць на пытанні адвакатаў, што такое паклёп, абраза, годнасць і гонар.

— Пытаюць у Скрабка, што такое паклёп, — прыводзіць словы Анджэя Пачобута baj.by. — Ён адказвае: «Паклёп — гэта калі пра чалавека сказалі няпраўду». «А што такое абраза?» — «Гэта калі чалавека абразілі». «Якія навуковыя метады вы выкарыстоўвалі?» — «Мы выкарысталі слоўнік Ожагава». Так гэта выглядала. Гэта смешна. Але мяне нервавала: яны не ведаюць нават гэтага! Я кажу: «Паслухайце, я трэці месяц сяджу, а вы не маглі ўзяць Кодэкс і прачытаць, што гэта значыць?».

Анджэй Пачобут з’яўляецца карэспандэнтам у Беларусі польскай «Газеты выборчай». У аснове крымінальнай справы — публікацыі журналіста: восем з «Газеты выборчай» і дзьве з інтэрнэту. Анджэю Пачобуту было прад’ўлена абвінавачанне па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу РБ — 368 (частка І) — «абраза» і 367 (частка І) — «паклёп» за тое, што ён назваў Лукашэнку дыктатарам.

# САЛІДАРНАСЦЬ - ГАЛОЎНАЯ ЗБРОЯ



Затрыманні і гвалт у дачыненні да тых, хто выказвае маўклівую нязгоду на вуліцах і плошчах, прыводзіць да яшчэ большых пратэстаў, і не толькі ў самой Беларусі, але і за яе межамі.

«У Беларусі мы назіраем рух у процілеглы бок ад дэмакратычных стандартаў. Рэакцыя ўлады нават даходзіць да абсурду і параноі. Апошнім часам людзей арыштоўваюць толькі за тое, што яны ходзяць па вуліцах. Не крычаць, не пратэстуюць, не носяць ніякіх лозунгаў, а толькі ходзяць па публічных месцах. За гэта іх арыштоўваюць і саджаюць у турму на некалькі сутак».

*Еўрадэпутат Яцэк Пратасевіч:*

Праваабаронцы сведчаць, што, нягледзячы на адсутнасць законных прыкмет правапарушэнняў падчас «народных гулянняў», падкантрольныя ўладзе суды паставілі расправу над затрыманымі на канвеер .

Усяго за час правядзення «маўклівых акцый», што адбываліся ў Беларусі с пачатку чэрвеня і да сярэдзіны ліпеня, было затрымана каля 1800 чалавек.

На большую частку затрыманых склалі пратаколы, сотні пакаралі арыштамі і штрафамі. Пры гэтым судовыя працэсы адбываюцца з абуральнымі парушэннямі працэсуальных норм, адкінуты ў бок такі асноватворны прынцып правасуддзя, як прэзумпцыя невінаватасці грамадзяніна.

Судзяць часта не ў будынках судоў, а нават проста ў пастарунках.

«Такая практыка вельмі агідная. З судовых працэсаў робяць паказальныя гульбішчы. Зараз гэта адбываецца па наступных прычынах: улада вырашыла рацыяналізаваць гэтыя судовыя гісторыі і пазбегнуць грамадскага кантролю за судовымі працэсамі. Гэта рэальна перашкаджае грамадскаму кантролю, рэальна перашкаджае працы праваабаронцаў».

*Праваабаронца Алена Танкачова.*

Праваабарончыя арганізацыі не могуць сабраць поўную інфармацыю аб арыштаваных, бо адсутнічаюць спісы зытрыманых, судовыя працэсы праходзяць у закрытым рэжыме.

У гэтых умовах Праваабарончы цэнтр «Вясна» прапануюе дапамогу затрыманым і іх сваякам пры абскарджванні судовых прысудаў, дапамагае заключыць дамову з адвакатам, выплаціць штраф. Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасць» прапануе арыштаваным аплаціць кошт лячэння пасля збіцця пры затрыманні альбо знаходжання за кратамі.

У акцыях «народных гулянняў» ёсць прыкметная рыса: удзельнікі акцыі і простыя мінакі ўпарта спрабуюць адбіць людзей ад невядомых асоб у цывільным, якія спачатку палююць на грамадзян на вуліцы, а потым хапаюць іх і цягнуць у аўтобусы без нумарных знакаў.

Удзельнікі акцый абураюцца: «Чаму міліцыя стаіць і глядзіць, як невядомыя запіхваюць людзей у машыны? Вы ж павінны абараняць нас, правапарадак!»





# БЕЛАРУСЫ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЦА ДЛЯ ДАПАМОГІ ЗАТРЫМАНЫМ

У Менску гэтымі днямі аднавіўся рух грамадзянскай салідарнасці з палітзняволенымі пад назвай «Анёл-ахоўнік».

Ўпершыню гэта ініцыятыва з'явілась пасля падзеяў 19 снежня, калі сотні людзей, якія пратэставалі супраць фальшавання вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, былі кінутыя за краты.

Абвестку пра патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе і валанцёрскай працы ў ліпені зноў змясцілі ў інтэрнэце:

«Падчас маўклівых акцый пратэсту сотні беларусаў апынуліся за кратамі. Арыштаваныя не толькі ўдзельнікі акцый, але і мноства звычайных мінакоў. На іх месцы мог апынуцца любы з нас.

Структуры МУС і суды хаваюць інфармацыю аб затрыманых. Чалавек проста «знікае», некалькі дзён невядома, дзе ён знаходзіцца.

Важна, каб у такі момант родныя не кідаліся ў жаху, а інфармацыя распаўсюджвалася як мага хутчэй. Важна, каб чалавек не заставаўся ў камеры без самых неабходных для жыцця рэчаў, не адчуваў сябе адзінокім і кінутым. Залежыць гэта ад усіх нас.

Прапануем далучыцца да грамадскай кампаніі «Анёл-ахоўнік». Яна не носіць палітычнага характару, удзельнічаць у ёй могуць людзі любых поглядаў. Галоўнае — жаданне дапамагчы.

Тыя, хто хоча гэта зрабіць, могуць стаць «анёлам-ахоўнікам» каго-небудзь са зняволеных. Для гэтага проста трэба зайсці на сайт help.roh-roh.net, выбраць чалавека са спісу і дапамагаць яму па меры магчымасцяў.

Многія людзі ўжо дапамагаюць зняволеным, многія хочуць дапамагаць. Але тое, што яны не ведаюць адно пра аднаго, можа ім перашкодзіць.

Напрыклад, чалавеку ў ізалятары часовага ўтрымання можна перадаць толькі адну перадачу ў дзень. Камусьці родныя і сябры прыносяць дзве ці тры — і не могуць іх перадаць. А ў той жа час у суседняй камеры людзі сядзяць без самага неабходнага.

Дзейнічаючы разам, можна пазбегнуць такіх памылак і хутка дапамагчы ЎСІМ затрыманым»,- гаворыцца ў звароце.

Сяргей Сматрычэнка і яшчэ некалькі чалавек-арганізатараў руху салідарнасці «Анёл-ахоўнік» кажуць, што на абвестку ў інтэрнэце ўжо адгукнуліся дзясяткі чалавек.

Неабыякавыя грамадзяне арганізавалі добраахвотны збор грошай на выплату штрафаў людзям, якіх затрымлівалі за апладысменты на вуліцах. Калі вы гатовыя дапамагчы ў аплаце штрафаў затрыманым падчас акцыяў маўклівага пратэсту, звяртайцеся, калі ласка, на Управу БНФ. Тэлефон: (017) 284 50 12.

Сабраныя грашовыя сродкі будуць перададзеныя ў ПЦ «Вясна». Ўжо сабрана 20 мільёнаў.

Таксама ў Менску дзейнічае ініцыятыва падтрымкі асуджаных за маўклівае плясканне ў далоні. Арганізатары просяць адгукнуцца тых, хто можа аказаць хоць нейкую дапамогу, а таксама тых, хто мае ў ёй патрэбу. Ініцыятыва з задавальненнем акажа дапамогу сваякам арыштаваных (з перадачамі, прававой кансультацыяй ці проста добрым словам), якія не жывуць у Менску.

Звяртайцеся да Дамінікі: тэл.: + 375 29 914 36 18 (velcom); skype: daminik-a

Тэлефон валанцёркі Насты: +375 29 555 49 41 (МТС).

Кашалькі вэб-мані:

Беларускія рублі: B749359163591

Расейскія рублі: R867924622709

Даляры: Z311448240008

Еўра: E421688564759



Сяргей Сматрычэнка, арганізатар ініцыятывы «Анёл-ахоўнік»:

**«З 4 ліпеня мы тут стаім пад сценамі турмы на Акрэсціна і пакуем перадачы. Людзей адгукнулася вельмі шмат, вялікая колькасць валанцёраў. Гэта самыя розныя, звычайныя людзі — ніякая партыя да гэтага дачынення ня мае, проста неабыякавыя людзі. Прыходзяць, каб перадаць грошы, каб пакаваць рэчы. Прыяжджаюць на машынах — нешта развозяць, ездзяць у краму, бо мы вялікімі партыямі ўсё купляем. І ўсё гэта вельмі прыемна і прыгожа».**



# Алена Ліхавід: «Я павінна змагацца разам са сваім сынам»



*Алена Ліхавід (другая з правага боку) падчас акцыі*

Падчас «маўклівай» акцыі 20 ліпеня была затрымана і арыштавана на 10 сутак Алена Ліхавід, маці зняволенага за Плошчу **Мікіты Ліхавіда**.

С пачатку траўня 2011 года юнак адбывае турэмнае пакаранне ў Наваполацкай калоніі, дзе трапіў пад жорсткія меры за тое, што называе сябе «незаконна асуджаным» і адмаўляецца выконваць правілы ўнутранага распарадку — ранішнюю зарадку. Мікіта лічыць, што калі ён па загадзе будзе штодня падымаць рукі дагары, гэта будзе азначаць, што ён здаўся.

Менавіта з-за гэтага адміністрацыя калоніі амаль ўвесь тэрмін трымае 21-гадовага хлопца ў карцэры. З траўня па ліпень Мікіта правёў там ужо 35 сутак. Гэта значыць 35 дзён на вадзе і хлебе, без свежага паветра, у цёмнай камеры, на голых нарах.

— Ад майго дзіцёнка засталася палова таго, калі ён пайшоў на Плошчу 19 снежня, — расказвала Алёна Ліхавід. — Ён страшна схуднеў — запалі вочы, абвастрыўся нос, цёмныя кругі пад вачыма. Бо з карцэру іх не выводзяць на вуліцу і ён казаў, што ён дыхае ў фортку ... Я не ведаю, адкуль у майго сына ў 20 гадоў столькі моцы і я, канешне, хачу, каб ён гэта ўсё вытрымаў. Я стараюся яго падтрымліваць, пішу яму кожны дзень.

З 20 ліпеня маці пазбаўлена магчымасці ліставаць сыну, бо сама знаходзіцца за кратамі.

Факт арышту Алёны Ліхавід выклікаў абурэнне ў дэмакратычнай грамадзе.

Сябры Грамадзянскай ініцыятывы «Вызваленне», якая была створана ў канцы мінулага года сваякамі фігурантаў крымінальнай справы аб масавых беспарадках 19 снежня, патрабавалі «ўсебаковага аб'ектыўнага разгляду бясчынстваў на вуліцах Мінска, учыненых «неўстаноўленымі» асобамі ў цывільным. Суддзя суду Цэнтральнага раёна Мінска Вайцяховіч палічыла доказы шасці здаравенных бугаёў, якія «храбра» захапілі адну жанчыну, пераканаўчымі. Мала для нашай улады месяцамі трымаць у карцэры яе сына Мікіту Ліхавіда, трэба яшчэ задушыць волю яго родных, прадэманстраваць сілу, ізаляваць ад грамадства», — гаворыцца ў заяве.

Актывісты «Вызвалення» паведамляюць, што на працягу апошняга месяца адміністрацыйныя затрыманні і суды прайшлі ў адносінах да **Марыны Лобавай**, маці палітзняволенага **Эдуарда Лобава**, і **Таццяна Севярынец**, маці апазіцыйнага палітыка **Паўла Севярынца**.

Алена Ліхавід за некалькі тыдняў да затрымання перадала ў незалежныя СМІ апошні ліст ад сына, які ён напісаў ў кароткім перапынку на «свабодзе» ў калоніі»:

«Мама, вось тут у газеце чытаў, што ў краіне поўны калапс! Вельмі перажываю, як вы там, як усе нашы. Адбылося тое, да чаго ўсё і ішло. Пытанне толькі: што яшчэ адбудзецца, што будзе далей? Цяпер настаў Ваш час сказаць сваё слова. Час тых, хто доўга маўчаў усе гэтыя гады, хаваючы свой страх».

— Я павінна змагацца разам са сваім сынам, і я буду змагацца, сказала па тэлефоне з міліцэйскага пастарунку 20 ліпеня Алена Ліхавід. — Буду выходзіць на гэтыя акцыі. Каб выказаць пратэст гэтаму рэжыму і ў знак салідарнасці са сваім сынам».



# ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ВАС ЗАТРЫМАЛІ ПАДЧАС «НАРОДНЫХ ГУЛЯННЯЎ»

***Раіць юрыст з Гомеля Леанід Судаленка.***

## Затрыманне

Важна памятаць, што супрацоўнікі міліцыі надзелены правам затрымаць і даставіць у аддзяленне міліцыі на тэрмін да 3-х гадзін практычна любога ня ўпадабанага ім грамадзяніна. На тэрмін звыш 3-х гадзін, але не больш чым на 72 гадзіны (трое сутак) могуць быць затрыманыя грамадзяне, падазраваныя ў здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння, за якое ў якасці спагнання прадугледжаны адміністрацыйны арышт (напрыклад, артыкул за «хуліганку»).

Як правіла, спачатку затрымліваюць для высвятлення асобы (наяўнасць пры сабе пашпарта пажадана, але не з'яўляецца гарантыяй ў такіх выпадках). Ужо потым, у залежнасці ад сітуацыі альбо адпускаюць, альбо складаюць адміністрацыйны пратакол.

Варта памятаць, што супрацоўнікі міліцыі самастойна ў дачыненні да затрыманага ніякага рашэння не прымаюць, усё залежыць ад каманды, якая паступіць ім з «Цэнтра», які пакуль дае каманды на папаўненне бюджэту штрафамі, у тым ліку і па артыкуле за «хуліганку» (выпадак гамяльчаніна Руслана Усціменка — па артыкуле 17.1 дробнае хуліганства, за які можна атрымаць максімальна 15 сутак арышту ён атрымаў 20 базавых велічынь штрафу, па артыкуле 23.4 непадпарадкаванне законнаму патрабаванню супрацоўніка міліцыі ён атрымаў 2 базавыя, хоць максімальная санкцыя да 1 750 000 рублёў).

Пры затрыманні раю нічога супрацоўнікам міліцыі не даказваць, яны «сляпыя» выканаўцы. Важна быць ахайна апранутым, мець пры сабе пашпарт асобы, ну і вядома пажадана нават піва не ўжываць перад акцыяй. У любым выпадку лёс затрыманага вызначыць «Цэнтр». Суд тут таксама значэння не мае, таму раю не марнавацца на адвакатаў. Адпусцяць праз тры гадзіны без складання пратаколу, значыць пашанцавала, складуць пратакол — пашанцавала менш.

Аб затрыманні фізічнай асобы супрацоўнікі міліцыі абавязаны скласці пратакол адміністрацыйнага затрымання, у якім паказваюцца дата і месца яго складання, пасада, прозвішча, імя і імя па бацьку службовай асобы, які склаў пратакол, звесткі пра асобу затрыманага, падставы, месца і час яго фактычнага затрымання. Копія пратакола ўручаецца затрыманаму па яго просьбе.

Калі пасля дастаўлення ў аддзяленне міліцыі Вас вырашылі абшукаць, раю не супраціўляцца, міліцыя мае права на асабісты перагляд у прысутнасці двух панятых. У сувязі з гэтым раю на акцыі нічога не браць з сабой лішняга.

Мабільны тэлефон супрацоўнікі міліцыі забіраць не маюць права, роўным чынам як і забараняць званкі,

за выключэннем выпадкаў змяшчэння ў ізалятар часовага ўтрымання. Раю не злоўжываць тэлефоннымі званкамі ў аддзяленні міліцыі, а зрабіць пару важных званкоў, паведаміўшы аб затрыманні сваім блізкім.

## Прад'яўленне абвінавачвання

Калі супраць Вас пачалі складаць адміністрацыйны пратакол аб здзяйсненні правапарушэння, няхай нават з самым абсурдным абвінавачаньнем, раю не панікаваць, усё роўна сітуацыю не зменіш.

Важна памятаць, што пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні павінен змяшчаць дату і месца яго складання, пасаду, прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, які склаў пратакол; звесткі аб асобе, у адносінах да якой вядзецца адміністрацыйны працэс; час, месца і абставіны здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння з указаннем на артыкул кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, які прадугледжвае адказнасць за дадзенае правапарушэнне; прозвішчы, імёны і імёны па бацьку, адрасы пацярпелых і сведкаў, калі яны маюцца; адзнаку аб тым, што асобе, у адносінах да якой вядзецца адміністрацыйны працэс, растлумачаны яго правы і абавязкі.

Пасля складання пратаколу раю яго ўважліва прачытаць і абавязкова падпісаць. Адмова ад подпісу ў знак не згоды з прад'яўлянымі абвінавачваннямі можа толькі пагоршыць Ваша прававое становішча, паколькі супрацоўнік міліцыі проста зробіць адмысловую адзнаку аб адмове. Разам з тым, у выпадку адсутнасці Вашага подпісу на пратаколе супрацоўнікі міліцыі

могуць яго перапісваць неабмежаваную колькасць разоў, не даючы пасля Вам шанцу выкарыстоўваць іх памылкі ў сваю карысць. Наяўнасць Вашага подпісу на пратаколе пазбаўляе іх такой магчымасці.

Важна перад сваім подпісам у пратаколе зрабіць сваё пісьмовае тлумачэнне адносна прад'яўленых абвінавачванняў і потым запатрабаваць копію пратаколу.

## Суд

Аб разглядзе адміністрацыйнай справы ў судзе падрабязна спыняцца не варта. Мне ўспамінаецца выпадак, калі на суд аднаго з грамадскіх актывістаў, які абвінавачваўся ў дробным хуліганстве з'явілася каля дваццаці яго калегаў. Пакуль мы праходзілі пашпартную працэдуру на пасту міліцыі і потым падняліся на другі паверх, мой калега атрымаў ужо сем сутак адміністрацыйнага арышту. Суд доўжыўся не больш трох хвілін.

Аб адсутнасці эфектыўнасці прысутнасці Вашага адваката на судзе я ўжо сказаў. Сведкі з Вашага боку пажаданыя, але вялікага значэння не маюць. Супраць Вас у судзе будуць хлусіць (ілжэсведчыць) супрацоўнікі міліцыі, распавядаючы суду як Вы гучна лаяліся матам, размахвалі рукамі, на заўвагі супрацоўнікаў міліцыі не рэагавалі.

Супраць абвінавачванняў у дробным хуліганстве праваабарончая супольнасць Беларусі яшчэ не выпрацавала спосабаў абароны, за выключэннем некаторых выпадкаў, пра якія я скажу ніжэй. Бывалі выпадкі, калі супраць хлуслівых паказанняў двух супрацоўнікаў міліцыі мы прыводзілі ў суд па пяць і больш сваіх сведак. Суд ацэньваў гэтыя паказанні крытычна, быццам бы яны накіраваны на пазбяганне магчымай адміністрацыйнай адказнасці.

Тут узнікае тонкі юрыдычны момант. Сам факт «хуліганкі» эфектыўна ўжо абскардзіць не атрымаецца ні ў вышэйстаячых судах, ні ў пракуратуры.

А вось падаць скаргу аб адсутнасці справядлівага судовага разбору кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом цалкам можна.

У такім выпадку, для тых, хто не спыняецца і жадае ў будучыні атрымаць маральную перамогу, з'яўляецца магчымасць падачы скаргі ў Камітэт ААН па правах чалавека пасля вычарпання ўсіх унутраных сродкаў прававой абароны.

Пасля абвяшчэння пастановы




трэба абавязкова ўзяць у суддзі яго засведчаную судом копію.

Абскарджанне судовай пастановы

Пастанову суда аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці можна абскардзіць у абласным судзе на працягу дзесяці сутак з моманту яго вынясення. Таксама скаргу хоць і не эфектыўна, але магчыма падаваць праз органы пракуратуры.

Скарга на пастанову суда адрасуецца ў абласны суд, але падаецца ў суд, які вынес пастанову, які пасля атрымання скаргі накіроўвае яе разам з адміністрацыйнай справай у вышэйстаячы суд. Пры падачы скаргі неабходна выплаціць на рахунак райфінаддзела дзяржаўную пошліну, памер якой залежыць ад памеру прысуджанага штрафу. Калі штраф менш 350 000 рублёў, дзяржпошліна складзе 17 500 рублёў, ад 350 000 рублёў да 3 500 000 рублёў — дзяржпошліна складае 70 000 рублёў.

Пасля разгляду скаргі ў абласным судзе, куды, як правіла, заяўнік запрашаецца позвай, скаргу яшчэ можна падаваць на працягу паўгода на імя старшыні абласнога суда, а таксама старшыні Вярхоўнага суду, рашэнні якога з'яўляюцца канчатковымі і абскарджанню на тэрыторыі краіны не падлягаюць.

Ледзь вышэй я сказаў аб магчымасці падачы скаргі ў Камітэт ААН па правах чалавека на адсутнасць справядлівага судовага разбору кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом. Гэты механізм з'яўляецца досыць складаным у частцы даказвання і яго трэба пачынаць ужо ў судзе першай інстанцыі, што без спецыяльных ведаў не пад сілу радавому чалавеку. Скаргі ў Камітэт ААН па правах чалавека ў Беларусі ўмеюць рыхтаваць як праваабарончыя арганізацыі, так і асобныя праваабаронцы. Аднак гэтая ўжо іншая тэма.

www.salidarnasc.org
Менск, 220005, а/с 148. e-mail: info@salidarnasc.org
Отпечатано с диапозитивов в типографии «Нева», г.Санкт-Петербург, ул.Герцена, 22 Заказ№8224, тираж299